**Траццяк Сяргей Аляксандравіч**
*Інстытут гісторыі НАН Беларусі (Мінск, Беларусь)*

# БЕЛАРУСКАЕ ПЫТАННЕ Ў ПАЛІТЫЦЫ САВЕЦКАЙ УЛАДЫ (ЛІСТАПАД 1917 г. — ЛІСТАПАД 1918 г.)

Аналіз дакументаў, матэрыялаў і даследаванняў, што датычацца заключэння ў лістападзе 1917 г. прыватных перамір'яў («салдацкіх міроў») паміж супрацьстаячымі расійскімі і германскімі войскамі ў Беларусі, а таксама паміж расійскім Заходнім фронтам і супрацьстаячай германскай групай армій генерала Эйхгорна, паказвае, што «салдацкія міры» мелі характар ваенна-тэхнічных, а не дзяржаўна-палітычных пагадненняў. Прадстаўнікі мясцовых цывільных органаў улады, насельніцтва Беларусі і бежанцаў-беларусаў да ўдзелу ў выпрацоўцы і падпісанні «салдацкіх міроў» не прыцягваліся, і пытанні будучага лёсу Беларусі ў гэтых дакументах не ўзнімаліся.

Галоўным для беларускага народа ў той час было выйсці з паласы спустошальнай вайны, захаваць сваё жыццё і дабрабыт. У падмурку дзеянняў беларускіх нацыянальна-палітычных сіл розных лагераў у канцы 1917 г. ляжала памкненне не дапусціць падзелу Беларусі паміж Германіяй і Расіяй і ўжыць усе сілы і захады, каб у пасляваенным свеце край уяўляў сабою адзіны цэлакупны дзяржаўны арганізм. Разам з тым, палітычна актыўным пластам і групам насельніцтва краю была відавочная няздольнасць Беларусі абараніць сваю самастойнасць і грамадскі лад толькі ўласнымі сіламі. Таму незалежніцкія настроі ў беларускім грамадстве традыцыйна былі слабыя. Кіраўніцтва Заходняй вобласці і фронту лічыла неабходным прыняць германскі ўльтыматум. На яго пазіцыю паўплываў, несумненна, той факт, што ў любым выпадку новая савецка-германская дзяржаўная граніца прайшла б на захад ад лініі расійска-германскага фронту, якая склалася на канец 1917 — пачатак 1918 г.

У пачатку снежня 1917 г. СНК Расійскай Рэспублікі выказаў пэўную зацікаўленасць у стварэнні аўтаномнай Беларускай вобласці савецкай Расіі. Такі крок дазволіў бы перавесці на практычныя рэйкі пытанне вяртання Расіі акупаваных Германіяй раёнаў Заходняй Беларусі і Літвы на падставе нацыянальнага самавызначэння. Але Краявы Усебеларускі з'езд Саветаў так і не адбыўся. Аблвыканкамзах і СНК Заходняй вобласці і Заходняга фронту ўхіліліся ад выканання ўмоў заключанага без іх удзелу і за іх спінамі пагаднення паміж Наркамнацам і Беларускім Абласным Камітэтам сялянскіх дэпутатаў. Белабласткам жа з самага

пачатку стаяў на пазіцыях непрызнання ўжо існуючай у краі савецкай улады. Скліканы ім і Вялікай Беларускай Радай у снежні 1917 г. I Усебеларускі з’езд быў разагнаны войскамі Мінскага гарнізона па загадзе СНК Заходняй вобласці і Заходняга фронту.

Кіраўнікі вобласці-фронта лічылі, што сапраўднае самавызначэнне — «самавызначэнне працоўных» — ужо адбылося праз абласныя савецкія структуры, і з гэтага часу лозунг права нацый на самавызначэнне служыць інтарэсам толькі нацыянальнай буржуазіі і памешчыкаў, але ніяк не працоўных. Гэтую іх упэўненасць толькі падмацоўвалі паведамленні з месцаў. Саветы і сходы працоўных краю выказваліся за неадрыўнасць Беларусі ад Савецкай Расіі, рашуча адвяргалі самавызначэнне на буржуазнай аснове, заяўлялі, што «толькі з’езд рабочых, сялянскіх і батрацкіх дэпутатаў, з’езд усёй беднаты горада і вёскі без адрознення нацыянальнасцяў», а не «адна толькі нацыянальнасць беларусаў», правамоцны вырашаць лёс Беларусі [2, с. 547—548]. Адсутнасць канкрэтных прапаноў наконт будучага статусу краю сведчыла, што для абсалютнай большасці беларускіх сялян, рабочых, для бальшавікоў-беларусаў ідэя савецкай дзяржаўнасці Беларусі блізкая ў той час не была. Але разгон I Усебеларускага з’езда і нечаканая для аблвыканкамзахаўцаў зацікаўленасць цэнтральнага Савецкага ўрада ў «беларускім пытанні» пэўным чынам адбіліся на падрыхтоўцы да II з’езда Саветаў Заходняй вобласці. Абласны з’езд павінен быў сабрацца 28 лютага 1918 г., каб завяршыць фарміраванне тэрыторыі вобласці, абраць новы склад Аблвыканкамзаха і рэарганізаваць вобласць-фронт у грамадзянскую адміністрацыйную адзінку. У Латвіі апошняе адбылося яшчэ ў лістападзе 1917 г.

20 снежня 1917 г. СНК Заходняй вобласці і Заходняга фронту паведаміў насельніцтву пра гатоўнасць «Цэнтральнага органа краявой улады» неадкладна папоўніць свой склад выбарнымі дэлегатамі ад «арганізацый, што яшчэ не маюць сваіх прадстаўнікоў» у ім [2, с. 600]. Відавочна меліся на ўвазе Віцебскі губсавет, Магілёўскі губвыканкам, магчыма, Белабласткам. Па шэрагу ўскосных дадзеных можна меркаваць, што III Надзвычайная канферэнцыя Паўночна-Заходняй абласной арганізацыі РСДРП(б) 23 снежня 1917 г. дазволіла правядзенне II Усебеларускага з’езда [6, с. 31].

Белабласткам, які легальна працаваў да мая 1918 г., планаваў склікаць II Усебеларускі з’езд з прадстаўніцтвам толькі самога БАК, губернскіх і павятовых сялянскіх Саветаў [7, с. 7]. IV Магілёўскі губернскі з’езд сялянскіх дэпутатаў, аднак, не падтрымаў ідэю «ўлады працоўнай сялянскай дэмакратыі» і прасіў УЦВК РСФСР дазволіць скліканне «II Усебеларускага з’езда Саветаў сялянскіх, рабочых і

салдацкіх дэпутатаў» з удзелам усіх Саветаў краю і франтавых арганізацый салдат — ураджэнцаў Беларусі [2, с. 720, 724].

Акупацыя заходняй і цэнтральнай частак Беларусі германскімі войскамі стварыла там спецыфічныя ўмовы для развіцця беларускага нацыянальна-палітычнага руху. Таксама факт акупацыі войскамі кайзераўскай Германіі часткі беларускіх зямель і няздольнасці Расіі абараніць іх адбіўся на развіцці працэсаў нацыянальна-дзяржаўнага самавызначэння Беларусі, прыспешыўшы абвяшчэнне 25 сакавіка 1918 г. беларускімі нацыянальнымі дэмакратамі незалежнасці Беларускай Народнай Рэспублікі.

У перыяд Брэсцкага міру пазіцыя Савецкага ўрада ў нацыянальным пытанні перажыла пэўныя змены. Канстытуцыя РСФСР, прынятая 10 ліпеня 1918 г., нічога не казала пра права нацый на самавызначэнне аж да дзяржаўнага аддзялення. У час дзеяння Брэсцкага міру цэнтральныя савецкія структуры ішлі насустрач Аблвыканкамзаху, бо лічылі неабходным мець на заходніх граніцах савецкай Рэспублікі такі ж надзейны палітычны, ваенны і эканамічны фарпост, як Туркестанская Савецкая Рэспубліка і Бакінская Камуна ў Азіі. У падмурак гэтых савецкіх аўтаномій быў пакладзены тэрытарыяльны прынцып. Агульным было перакананне, што ва ўмовах ваеннай інтэрвенцыі дзяржаў Чацвярнога саюза і Антанты ў Расію, нацыянальна-дзяржаўнае самавызначэнне савецкіх тэрыторый у рэшце рэшт пойдзе на карысць толькі ворагам РСФСР [10, с. 55—56; 12, с. 88—89].

Тым не менш да лета 1918 г. практычна ўсе працоўныя пласты насельніцтва Беларусі паядналі адмоўныя адносіны да акупантаў, якія пераносіліся і на тых мясцовых дзеячоў, што па ўласнай ініцыятыве і з уласных разлікаў пайшлі на супрацоўніцтва з імі. На працягу вясны — лета 1918 г. па савецкай частцы Усходняй Беларусі прайшла хваля пратэстаў супраць тэрытарыяльных дамаганняў Германіі, Украіны і Беларускай Рады, арганізаваная Белнацкамам. Пратэстная хваля ахапіла таксама масу беларусаў (бежанцаў і вайскоўцаў) у савецкай Расіі, перакінулася на раёны часовай акупацыі. У выніку пратэстнай кампаніі пытанні аб дакладным праходжанні дэмаркацыйнай лініі і аб унутраным становішчы раёнаў часовай акупацыі, як маючыя не тэхнічнае, а прынцыповае значэнне, былі перанесены ў маі 1918 г. на разгляд савецка-германскай палітычнай камісіі па выпрацоўцы ўмоў дадатковага дагавору.

Пратэстная кампанія паказала, што ў прыфрантавых раёнах ідэя беларускай савецкай дзяржаўнасці (нават у форме аўтаноміі) мела няшмат прыхільнікаў. Абсалютная большасць працоўных краю выказвалася за знаходжанне Беларусі ў складзе РСФСР, радзей — за «федэрацыю» або «саюз» з ёю без указання іх канкрэтнай формы. Патрабаванні «Беларускай Федэратыўнай Савецкай Рэспублікі ў [саюзе] з вялікай свабоднай

працоўнай Расіяй» (Каралёўская воласць Віцебскага павета) або «сваёй Расійскай Беларускай Рэспублікі» (Саўская воласць Горыцкага павета Магілёўскай губерні) былі адзінкавыя [4, с. 395; 8, с. 81].

Наадварот, у бежанскім асяроддзі ідэя, што Беларусь павінна скласці «адзіную аўтаномную адзінку» РСФСР, а лёс беларусаў можа вырашыць толькі «агульнабеларускі народны сход», а ніяк не «самазваная Рада», была надзвычай папулярная. 17—21 ліпеня 1918 г. у Маскве прайшоў II Усерасійскі з'езд бежанцаў з Беларусі, які сабраў 220 дэлегатаў ад 3 млн чалавек. У сваіх рэзалюцыях [1, с. 158—163] з'езд выказаў салідарнасць з працоўнымі Расіі і асудзіў «незалежнасць, што насаджаецца немцамі з дапамогай беларускіх памешчыкаў». З'езд выказаў пратэст супраць «падзелу Брэсцкім мірам беларускага народа», патрабаваў «з'яднання разадранай Беларусі і надання ёй права на федэратыўную сувязь з Расійскай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікай». Першачарговымі задачамі будучага Савецкага ўрада Беларусі з'езд назваў вяртанне памешчыцкай зямлі сялянам, аднаўленне ўлады Саветаў, «адкліканне з Беларусі чужаземных войскаў» і перадачу «справы грамадскай бяспекі» ў рукі народнай міліцыі, аднаўленне на савецкіх пачатках дзейнасці школ і культурна-прасветных устаноў у краі, арганізацыю дапамогі бежанцам. Зазначалася неабходнасць самастойнага ўдзелу Беларусі ў будучай сусветнай мірнай канферэнцыі. Першая канферэнцыя беларускіх савецкіх партый і арганізацый (Петраград, 23 жніўня 1918 г.), якая сабрала звыш 40 дэлегатаў, прыйшла да высновы, што Беларусь можа існаваць толькі як аўтаномная ў палітыка-адміністрацыйных, эканамічных і культурна-нацыянальных адносінах дзяржаўная адзінка ў федэратыўным саюзе з усімі расійскімі абласцямі і прызнала задачаю моманту выяўленне і прыцягненне ўсіх сіл Беларусі для работы ў справе яе адбудавання [5, с. 133—134].

Дадатковы дагавор ад 27 жніўня 1918 г., заключаны паміж РСФСР і Германіяй у Берліне, падмацаваў у германскіх кіруючых колах тэндэнцыю супрацоўнічаць з бальшавікамі, пакуль яны яшчэ ва ўладзе, бо толькі бальшавіцкі ўрад быў гарантам атрымання кантрыбуцыі з Расіі, аднак ён жа выклікаў і рэзкія супярэчнасці паміж Германіяй, яе саюзнікамі і сатэлітамі. Пачатак адыходу германскіх акупантаў у верасні 1918 г., які быў непасрэдным вынікам Берлінскага дадатковага савецка-германскага дагавору, выклікаў ажыўленне ў грамадска-палітычным жыцці і адразу змяніў суадносіны сіл у часова акупаваных раёнах Беларусі на карысць бальшавікоў. Насельніцтва занятых германскімі акупантамі раёнаў звязвала з прыходам савецкіх войск надзеі на радыкальныя пераўтварэнні ў інтарэсах працоўных мас —

найперш на радыкальную зямельную рэформу, — і на магчымасць звесці рахункі з непасрэднымі ворагамі.

Пачатак вызвалення Беларусі ад германскіх акупантаў, які быў вынікам Берлінскага дагавора 27 жніўня 1918 г., выклікаў прыліў энтузіязму ў Белнацкаме і Беларускіх камуністычных секцыях РКП(б). Там палічылі, што справа неадкладнай нацыянальна-дзяржаўнай рэарганізацыі Заходняй вобласці павінна стаць цэнтральным пытаннем III з'езда Саветаў Заходняй вобласці (11—13 верасня 1918 г.). На думку «таварышаў беларусаў», акт абвяшчэння Беларуска-Літоўскай вобласці РСФСР з адначасовай перадачай бежанскай справы ў рукі абласных улад паралізаваў бы дзеянні памешчыцка-буржуазных «самасційнікаў», адарваў бы ад іх тую частку працоўных, што купілася на «незалежніцкую» рыторыку, імкнучыся да стварэння нацыянальных дзяржаў, пазбавіў бы падставы абвінавачванне бальшавікоў у «чырвоным імперыялізме», якое зыходзіла з лагера нацыянальнай дэмакратыі. Канчатковае ж самавызначэнне Беларусі ў форме аўтаномнай савецкай рэспублікі РСФСР павінна было адбыцца на Усебеларускім з'ездзе Саветаў пасля выгнання акупантаў [9, с. 314—315].

Дэлегацыя Белнацкама і балтыйскіх маракоў-беларусаў на абласны з'езд Саветаў заручылася падтрымкаю УЦВК РСФСР. Але Аблвыканкамзах адмовіўся выносіць белнацкамаўскі праект на разгляд з'езда на той падставе, што ён зыходзіў не ад Саветаў вобласці. Беларуская дэлегацыя як не маючая дачынення да вобласці не атрымала права рашаючага голасу. Выступленне на з'ездзе І. Лагуна, як прыгадаў Г. Гарэцкі, стрэнута было дэлегатамі холадна, нават варожа [3, с. 153]. З'езд перайменаваў Заходнюю вобласць у Заходнюю Камуну, тым самым заканадаўча абвясціўшы яе «самачынную аўтаномію» ў складзе РСФСР, але нацыянальна-дзяржаўны статус вобласці застаўся без змен.

Рашэннем НКУС РСФСР ад 31 кастрычніка 1918 г. зацвярджалася не Беларуска-Літоўская вобласць, а Заходняя Камуна РСФСР у складзе Смаленскай, Магілёўскай, Віцебскай, Мінскай, Ковенскай, Віленскай і Гродзенскай губерняў з цэнтрам у Смаленску. На карысць гэтага рашэння, лічылі ў НКУС, сведчылі гістарычнае мінулае, геаграфічныя і гаспадарчыя ўмовы, побытавая аднароднасць рэгіёна [11, с. 73—75]. Толькі праз паўтара месяцы пасля III з'езда Саветаў Заходняй вобласці ў Маскве прыйшлі да высновы, што не Беларуска-Літоўская вобласць, а Заходняя Камуна найбольш адпавядае міжнародным задачам Савецкай улады. Шматнацыянальная Заходняя Камуна, куды Беларусь уваходзіла разам з Літвой і Смаленшчынай, павінна была стаць фарпостам РСФСР на Захадзе, яе варотамі ў Германію і Польшчу. Тыпалагічна яна

была б утварэннем таго ж рангу, што Туркестанская Савецкая Рэспубліка і Бакінская Камуна ў Азіі. Але гісторыя распарадзілася так, што Заходняй Камуне ў граніцах ад 31 кастрычніка 1918 г. не давялося праіснаваць нават дня.

Заходняя Камуна, у склад якой павінны былі ўвайсці і тыя тэрыторыі, што, згодна Брэсцкаму міру, належалі Германіі, стваралася як тылавая база наспяваючай рэвалюцыі ў Германіі і Польшчы і наступальнай рэвалюцыйнай вайны Савецкай Расіі ў Заходняй Еўропе. Аднак менавіта Германская рэвалюцыя, якая перамагла 9 лістапада 1918 г., пахавала яе першапачатковы праект. Далейшыя крокі цэнтральнага Савецкага ўрада, абласных улад Заходняй вобласці і Белнацкама ў справе вырашэння беларускага пытання залежалі ад ходу і вынікаў распачатага пасля 13 лістапада 1918 г. Заходняга паходу Чырвонай Арміі, ваеннай інтэрвенцыі краін Антанты ў Прыбалтыцы і рэвалюцыйных падзей у Германіі і Польшчы.

**Бібліяграфічны спіс**


1. Борьба за Советскую власть в Белоруссии: 1918—1920: сб. док. и материалов: в 2 т. — Минск, 1968. — Т. 1.
2. Великая Октябрьская социалистическая революция в Белоруссии: сб. док. и материалов: в 2 т. — Минск, 1957. — Т. 2.
3. Гарэцкі, Р. Ахвярую сваім «Я»... (Максім і Гаўрыла Гарэцкія) / Р. Гарэцкі. — Мінск: НіТ, 1998.
4. Документы и материалы по истории Белоруссии. Т. 4: Из истории установления Советской власти в Белоруссии и образования БССР. — Минск, 1954.
5. Игнатенко, И.М. Октябрьская революция и самоопределение Белоруссии / И.М. Игнатенко. — Мінск: НиТ, 1992.
6. Ігнаценка, І.М. Кастрычніцкая рэвалюцыя на Беларусі / І.М. Ігнаценка // Беларус. гіст. часоп. — 1997. — № 4.
7. Канчер, Е.С. Из истории общественных, национальных и революционных движений белорусов. — Пг.; М., 1918—1919. — Ч. 2. Вып. 1: Белорусский Областной Комитет — 1-й Всебелорусский съезд.
8. Крах немецкой оккупации в Белоруссии в 1918 году: сб. док. — Минск, 1947.
9. Круталевич, В.А. Рождение Белорусской Советской Республики (На путях к провозглашению республики: Октябрь 1917 — декабрь 1918 г.) / В.А. Круталевич. — Минск: НиТ, 1975.
10. Образование СССР: 1917—1924: сб. док. и материалов. — М.; Л., 1949.
11. По воле народа: Из истории образования БССР и Компартии Белоруссии: сб. док. — Минск: Беларусь, 1989.
12. Сталин, И.В. Соч. — М., 1949. — Т. 4.